REDEMOS

RECONFIGURING EU DEMOCRACY SUPPORT. TOWARDS A SUSTAINED DEMOS IN THE EU'S EASTERN NEIGHBOURHOOD

**Кароткі агляд палітыкі 2**

# Стратэгічная яснасць і рашучасць: супрацьстаянне Расіі ў бліжніх еўрапейскіх рэгіёнах

Ігар Грэцкі

травень 2025




Funded by the European Union

The REDEMOS project has received funding from the European Union's Horizon Europe research and innovation programme under grant agreement No 101061738. The Associated Partner University of Surrey has received funding from UK Research and Innovation (UKRI) under the UK government's Horizon Europe funding guarantee under grant number 10040721. The Associated Partner University of St. Gallen has received funding from the Swiss State Secretariat for Education, Research and Innovation (SERI). Views and opinions expressed are, however, those of the author(s) only and do not necessarily reflect those of the European Union, UKRI and SERI. Neither the European Union nor UKRI or SERI can be held responsible for them.

## Агульная пастаноўка пытання

Расійскі палітычны істэблішмент заўжды ўспрымаў распад Савецкага Саюза не як магчымасць пачаць працэс руху да паўнацэннай дэмакратызацыі, але як увасабленне паражэння СССР і, адпаведна, перамогі Захаду ў халоднай вайне. У цэлым, Крэмль разглядае суседнія малыя і сярэднія дзяржавы як неад'емна залежныя аб'екты ўплыву буйных дзяржаў, і пры гэтым, у прыватнасці, рэгіён на ўсходняй мяжы ЕС разглядаецца як выключная прастора «асобай адказнасці» Расіі і, адпаведна, у такой якасці – як неад'емны кампанент яе самаабвешчанага статусу вялікай дзяржавы.

Па сутнасці, Расія падхапіла старую савецкую канцэпцыю «абмежаванага суверэнітэту», адкрыта адмаўляючы права размешчаных на ўсходняй мяжы ЕС краін на самастойнае вызначэнне свайго замежнапалітычнага курса. Гэты падыход цалкам праявіўся ў вайсковай агрэсіі Расіі супраць Грузіі і Украіны, а таксама ў яе гібрыднай падрыўной дзейнасці, скіраванай супраць кожнай краіны ў зоне ўсходняга суседства ЕС. Больш за тое, ультыматум Крамля ад 17 снежня 2021 г., які патрабуе ад Захаду прадаставіць Расіі гарантыі праўнай бяспекі, сведчыць пра тое, што яго геапалітычныя амбіцыі выходзяць далёка за межы рэгіёна, што мяжуе з ЕС на ўсходзе. У гэтых акалічнасцях дзяржавы-сябры ЕС павінны адаптаваць сваю вонкавую палітыку для ўмацавання ўласнай бяспекі, а таксама дапамагчы краінам зоны ўсходняга суседства ЕС супрацьстаяць спробам Расіі падарваць іх суверэнітэт і тэрытарыяльную цэласнасць.

## Ключавыя высновы

- Галоўнай мэтай Расіі ў яе падыходзе да краін - усходніх суседзяў ЕС з'яўляецца падрыў іх суверэнітэту і ўстанаўленне эфектыўнага кантролю за іх рашэннямі як ва ўнутранай, гэтак і ў вонкавай палітыцы.
- Дзеянні расійскага ўрада выходзяць са здагадкі, што геапалітычныя бітвы выйграе не той, хто валодае вялікім эканамічным патэнцыялам і больш высокім ВУП на душу насельніцтва, а той, хто захоплівае ініцыятыву ў інфармацыйнай прасторы і паспяхова навязвае сваім супернікам свой уласны светапогляд.
- Масква больш падтрымвае краіны на ўсходняй мяжы ЕС, якія схільныя дэманстраваць адкрытую лаяльнасць Крамлю, не кідаюць выкліку расійскаму геапалітычнаму дамінаванню і яднаюцца супраць заходняга свету. І наадварот, для ўрадаў, адкрыта схільных да інтэграцыі з ЕС і НАТО, Расія імкнецца стварыць магчыма больш праблем і пасля настойліва прапанаваць іх загадзя падрыхтаваныя рашэнні ў абмен на геапалітычныя саступкі.
- У краінах, што характарызуюцца прасторай для палітычнай канкурэнцыі і свабоды СМІ, Расія ўзмацняе ціск на непакорлівыя эліты, ствараючы або фінансуючы прарасійскія палітычныя партыі і засноўваючы сродкі масавай інфармацыі для прасоўвання і ўзмацнення антызаходніх наратываў.
- Крэмль імкнецца атрымаць замежнапалітычныя перавагі ў краінах зоны ўсходняга суседства ЕС, выкарыстоўваючы слабыя бакі іх палітычных і сацыяльных інстытутаў, а таксама дыскрэдытуючы саму ідэю еўрапейскай інтэграцыі.
- Знешняя палітыка Расіі ў дачыненні краін рэгіёна, што мяжуе з ЕС на ўсходзе, характарызуецца моцнай інэрцыяй і наўрад ці істотна зменіцца, прынамсі, у сярэднетэрміновай перспектыве, паколькі яе знешняя дзейнасць глыбока ўкаранена ў асаблівасці інстытуцыйнага ўпарадкавання расійскай палітычнай сістэмы, грамадскай структуры і эканамічнай мадэлі.

## Рэкамендацыі па палітыцы

- **Еўропа як гарант бяспекі:** вельмі важна распрацаваць доўгатэрміновыя інвестыцыйныя стратэгіі, што ахапляюць як вайскова-прамысловы сектар ЕС, гэтак і жорсткую інфраструктуру бяспекі ў краінах усходняга суседства ЕС, што імкнуцца да цяснейшых сувязяў з Еўрасаюзам. У той жа час, ключавым фактарам з'яўляецца паскарэнне інтэграцыі гэтых краін у ЕС і НАТО, а таксама збольшанне інвестыцый у дыверсіфікаванне сетак паставак энергіі і электраэнергіі.
- **Новыя стратэгічныя пасланні:** З нападам Расіі на Украіну ў знешняй палітыцы шмат якіх краін ЕС адбыўся глыбокі зрух ва ўспрыманні Крамля. Расія, якую раней называлі складаным партнёрам, цяпер больш рэалістычна ацаняецца як доўгатэрміновая пагроза еўрапейскай бяспецы. Гэта тэндэнцыя павінна быць адлюстравана ў абноўленай агульнай стратэгіі ЕС у дачыненні Расіі і краін Усходняга партнёрства; гэта стратэгія павінна пазбягаць саманавязваемых «чырвоных ліній» і не павінна праяўляць страху перад Расіяй. На практыцы важна не ўскладняць пастаўкі зброі Украіне штучнымі абмежаваннямі па яго тэрытарыяльным выкарыстанні. Апроч таго, заходнім урадам неабходна праяўляць меншую адчувальнасць да ядзернага шантажу Крамля. Ваганні і нявызначанасць Захаду ў адносінах да Расіі яшчэ больш узмацняюць жаданне Пуціна павысіць стаўкі.
- **Ніякіх «шэрых зон» у Еўропе:** Гэты прынцып павінен састаўляць фундаментальную аснову знешняй палітыкі ЕС у дачыненні дзяржаў, суседніх з Еўрасаюзам на ўсходзе. Адхіленне ад гэтага правіла ў надзеі на дасягненне кампрамісных пагадненняў з Крамлём за кошт суверэнітэту суседніх краін можа ў канчатковым выніку прывесці да стратэгічнага паражэння для Еўропы. Вельмі важна стварыць гарантыі таго, каб краіны на ўсходніх межах ЕС, што імкнуцца да еўрапейскай інтэграцыі і дасягаюць прагрэсу ў рэфармаванні сваіх палітычных і сацыяльных інстытутаў, не былі пакінуты сам-насам з пагрозамі рэвізіяніцкай Расіі.
- **Нулёвая талерантнасць да расійскай прапаганды:** Вельмі важная пільнасць, улічваючы мэту папярэджання ўплыву расійскай прапаганды ў інфармацыйным ландшафце ЕС; таксама неабходна спрыяць аналагічным практыкам у краінах усходняга суседства ЕС. Супольныя намаганні важныя для супрацііву шырэнню расійскіх наратываў у СМІ краін-сяброў і кандыдатаў на членства ў ЕС і гэта працідзеянне трэба падтрымваць шляхам укаранення самых сучасных праграм развіцця крытычнага мыслення і лічбавай пісьменнасці на ўсіх роўнях іх сістэм адукацыі. Апроч таго, патрэбна ўдасканаліць адпаведныя працэдуры прыпынення дзейнасці расійскіх СМІ, што практыкуюць мову варожасці і дэзынфармацыю ў ЕС. Варта выключыць сітуацыю, калі прапагандысцкія тэлеканалы Крамля былі б забаронены ў адных краінах, але адначасова карысталіся неабмежаваным доступам да аўдыторыі ў іншых.

Поўнае даследаванне – **REDEMOS D7.2 Наратывы знешніх прэтэндэнтаў на нормы ў рэгіёне ўсходняга суседства з ЕС** – даступна па спасылцы: https://redemos.eu/resources/publications/working-papers/

**REDEMOS: REconfiguring EU DEMOcracy Support.**
**Towards a sustained demos in the EU's Eastern Neighbourhood**
REDEMOS- 101061738
HORIZON-CL2-2021-DEMOCRACY-01-04

**Dr Mădălina Dobrescu, NTNU**
**info@redemos.eu**

redemos.eu    @REDEMOS_eu    REDEMOS Horizon Europe Project